Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem

Цана асобнага нумару 20 грошаў.

НАШ ГОЛАС

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6)
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй.
Пэрамена адрэса 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 9 — Вільня, Серада 23-га лютага 1927 г. — Год I

№ 8 „Нашага Голасу" з 19/II сканфіскаваны Камісарам Ураду на м. Вільню за гэткія стацьці: 1) перадавіцу „Заслона прыадкрылася", 2) стацьцю „Урадавая праграма", 3) карэсп. з Горадні „Рэпрэсіі трываюць далей", 4) карэсп. з Ліды „Перашкоды ў працы беларускіх культурных установаў з боку мяйсцовай адміністрацыі ня спыняюцца", 5) карэсп. з Маладэчанскага пав. „Ахвяра перасьледаваньняў", 6) карэсп. з Косава „Пахароны Косаўскіх ахвяр", 7) дробныя весткі з вёскі пад загалоўкам „Нам пішуць з вёскі, што"...

Мы публічна пытаемся ў п. пракурора суда: няўжо ж у Польшчы істнуюць законы, якія забараняюць выкрываць праз прэсу надужыцьці мясцовых уладаў?

Аджыўшая ідэя.

Калі ўзьнялася сусьветная вайна, выступілі з аружжам у руках адны проці адных работнікі розных краёў і народаў і з нязвычайнай заўзятасьцяй нішчылі сябе ўзаемна — дзеля карысьці слаўшае іх на сьмерць дзеля ўласнае карысьці „радзімае" буржуазіі. Рука забойцы, які з-за кута забіў найвялікшага павадыра францускага сацыялізму, Жана Жорэса, заўсёды вернага ідэалам работніцкае еднасьці,—як-быццам забіла і самую гэную еднасьць працоўных масаў розных краёў і народаў. І на доўгія гады сусьветны работніцкі кліч „Працавітая бедната ўсіх краёў, злучайся!" стаўся як-быццам пустым гукам...

Але гады пасьляваеннае руіны, гады голаду і нэндзы працоўных усіх краёў, прымаўшых учасьце ў крывавай бойні,—разьвеялі крывавы туман, што быў спавіў і затуманіў галовы людзей. Глянуўшы на ўсё тое зло, якое людзі самі сабе зрабілі, масы зьняў жах. І ніхто ня ў сілах ужо думаць аб паўтарэньні страшэнстваў вайны...

Ніхто—апрача тых, каму і мінулая вайна была карысна, дый кожная новая будзе карысна. Сусьветны капітал не затрымліваецца ні перад чым, калі яму гэта выгадна...

І вось мы бачым пачатак ваенных крокаў Англіі ў Кітаі, які вінават перад эўрапэйскім і амэрыканскім капіталам толькі тым, што „збунтаваўся" і ня хоча, каб чужынцы далей смакталі з яго кроў... Але сяньня работніцкія масы Англіі—ўжо ня тыя, што былі 12 гадоў назад. І вось мы зьяўляемся сьведкамі магутнага масавага пратэсту работніцкае Англіі—проці авантуры, распачатай Англіяй капіталістаў.

„Рукі вон ад Кітаю!"—вось лёзунг, які ўсё ямчэй і ямчэй чуваць у работніцкіх масах Англіі. Гэтак толькі-што адбылася сэсія рады лёнданскіх прафэсіянальных саюзаў, якая выступіла *з вострым пратэстам проці аружнае інтэрвэнцыі Англіі ў Кітаі.* Рада прыняла цэлы рад важных пастановаў, якія—паміж іншым - *заклікаюць* мяйсцовыя палітычныя і прафэсіянальныя арганізацыі *затрымліваць параходы з войскам, аружжам ды іншымі войсковымі матэрыяламі.* Адна з рэзалюцыяў трэбуе прызнаньня Кантонскага (чырвонага) ўраду за нацыянальны ўрад усяго Кітаю, да дабравольнага адрачэньня англійскімі грамадзянамі ад усіх асаблівых прывілеяў у Кітаі, да падпісаньня з Кантонскім урадам міравога трактату. Урэшце — прафсаюзы пастанавілі паслаць у Кітай адумысную дэлегацыю.

Гэта-ж—якраз тое, што напярэдадні сусьветнае вайны прапаведываў, да чаго клікаў і за што злажыў сваю галаву — Жан Жорэс. Ідэя, якая ў 1914 годзе аказалася бяссільнай проці імпэрыялістычных імкненьняў капіталу, на нашых вачох *адраджаецца* і моцным голасам—вуснамі англійскіх работнікаў—кліча арганізатарам ваеннае авантуры: *не пазволю!*

І гэты магутны кліч, падтрыманы міліёнамі працоўных усіх краёў і народаў, можа больш пэўна забясьпечыць сьвет ад новага шалёнага праліцьця крыві, чым усе няшчырыя, крывадушныя нарады і пастановы так-званае „Лігі Народаў", правільней—акцыйнага таварыства дзяржаўных народаў дзеля бяскарнае эксплёатацыі народаў цалком ці напалову паняволеных!

У Сойме.

Як Сойм прыняў бюджэт?

14 лютага — на апошнім галасаваньні, пасьля трэцяга чытаньня—Сойм прыняў бюджэт на 1927—28 г.

У часе рашучых галасаваньняў у Сойме быў увесь габінэт, — навет з прэм'ерам Марш. Пілсудскім. „Роботнік" сцьвярджае, што Марш. Пілсудскі — першы раз пасьля „траўня"—зьявіўся на пленуме Сойму.

За бюджэт галасавалі клюбы: „хрысьціянскіх нацыяналістаў", хадэкаў, пястоўцаў, вызваленцаў, сельсаюзьнікаў (польскіх), і „Клюб Працы" (група Бартля). Проці галасавалі: пэпэсы, „работнікі - нацыяналісты", усе меншасьці, апроч жыдоў, эндэкі і камуністы. Устрымаліся—жыдоўскія паслы.

Абыйшлося ўсё, як бачым, досьць мірна. А ўсе чамусьці спадзяваліся вялікага баявога дня, у выніку якога мог быццам быць—распушчаны Сойм. Урадавая прэса зрабіла ўсё, каб настрашыць паслоў і публіку гэтай небясьпекай. Вострая прамова віцэпрэм'ера так сама суліла расправу за непакорнасьць законадаўчай улады—ўладзе выканаўчай. Але ў апошні мамэнт урад, хоць быццам-то меў у руках гатовы прыказ аб роспуску Сойму,—не пайшоў на востры канфлікт з парламантам. Дый ня было чаго сварыцца: бюджэтная камісіі—перад трэцім галасаваньнем — адкінула ўсе тыя папраўкі клюбаў, якія прапанавалі непажаданыя для ўраду зьмены у бюджэце, а Сойм толькі падцьвярдзіў пастанову камісіі.

Гэткім чынам Соймам адкінуты прапазіцыі: аб зьмяншэньні на 58 мільён выдаткаў на армію (шляхам зьмяншэньня лічбы войска на 50 тысяч.), аб павялічэньні выдаткаў на дапамогу безработным і на падвышку пэнсіяў урадоўцам — на 250 мільёнаў (дзеля гэтага прапанавалася спагнаць адпаведную суму з капіталістаў, прамыслоўцаў і абшарнікаў, недаплаціўшых маёнтковага падатку). Правалена і папраўка „вызваленьня" аб дадаткавым асыгнаваньні 15 мільён. на павялічэньне фонду Зямельнага Банку — на крэдыты для „дробных рольнікаў" (ведама-ж, і асаднікаў!).

Правалены ўласьніцкай большасьцю Сойму рад прапазіцыяў лявіцы—аб павялічэньні асыгнаваньня грошаў на розныя асьветныя, культурныя ды дабрадзейныя мэты. Правалены прапазіцыі аб павялічэньні на $2^1/_2$ мільёнаў на падняцьце зямляробства і на 1 мільён.—фонду для паляпшэньня грунтаў.

Цікаўна, што ўрад праглынуў шмат няпрыемных для яго рэчаў з боку Сойму.—Перад усім найбольш дасталася мін. Мэйштовічу і яго міністэрству: праваліўся крэдыт на „Праўнічную Раду" і прайшла дэманстрацыйная прапазіцыя аб скасаваньні 100 злотых з выдаткаў на міністэрскую цэнтралю, як выражэньне асабістага недаверыя міністру. Правалілася і створаная ўрадам спэцыяльна для пілсудчыка пасла Медзіньскага новае міністэрства Пошгаў, бо Сойм адкінуў усялякія крэдыты на гэта. Дасталося і міністэрству ўнутраных спраў, з бюджэту якога зьняты 1,100 тысяч—з „дыспазіцыйнага фонду" (з якога, як ведама, падтрымліваецца ўсялякага роду тайная агентура). Апрача таго, на наступным паседжаньні Сойму маюць яшчэ разглядацца прапазіцыі Вызваленьня і камуністаў—аб выражэньні недаверыя ўсяму ўраду (камун.) і—міністрам Мэйштовічу і Незабытоўскаму (Вызвал.).

Гэткім чынам, аканчальныя лічбы бюджэту выглядаюць так:

Выдаткі звычайныя—1 мільярд 863 мільён. 730,726 злот., надзвычайныя—103 мільён. 505,119 зл.; апрача таго—даплатаў да „даходных" прадпрыемстваў паньствовых 14,841.193 з.

Усяго разам выдаткаў—1,982,079.038 зл., ці бязмала 2 мільярды.

Даходаў „адміністрацыйных" (папросту—з падаткаў ды іншых пабораў пераважна) — 1,232,931,197 зл., чысты даход з дзяржаўных прадпрыемстваў — 106,557,630 зл., даходы з манаполіяў—646,517,000 зл.; усяго даходаў—1,986,005,827.

Дыскусія над „баявой" прамовай віцэ-прэм. Бартля.

Пасьля сваей „баявой" прамовы віцэпрэм. Бартэль раптам захварэў.

Дык дыскусія над яго прамовай, якой патрэбаваў эндэк Гломбіньскі, адбылася ў яго адсутнасьці. Наагул, дыскусія была значна мягчэйшая, чым можна было спадзявацца ад усіх абаронцаў парляментарызму ў польскім Сойме.

П. Гломбіньскі вельмі стрымана напомніў віцэ-прэм. Бартлю, што—„Польшча зьяўляецца яшчэ Рэспублікай, дый што ўрад ў цэлым, як і кожны міністар паасобку,—парляментарна адказныя перад Соймам наводле Канстытуцыі". Дык—ня ўрад пакліканы на тое, каб рабіць кантроль над Соймам ды „адзвычайваць яго ад дрэнных звычаяў і вадаў", але — якраз наадварот: Сойм створаны дзеля кантролю над урадам і адвучэньня ўраду і яго органаў ад вадаў і надужыцьцяў".—Бо-ж ня ўрад зьяўляецца прадстаўніком народу, які паводле Канстытуцыі мае Вярхоўную ўладу ў дзяржаве, але — парлямант, паклікаены для выражэньня ў ім волі народу. Пасьля пасол казаў аб вялікіх заслугах Сойму, якога так лае ўрад, які з свайго боку, маючы вялізарныя паўнамоцтвы, дагэтуль апрача пустой пахвальбы, не зрабіў амаль-што нічога. „Сіла ўраду ня ў фізычнай яго сіле, укрытай ад народу, ды не ў дзеяльнасьці яго кіраўнікоў, але—ў даверыі ды яго ў краі ды ў яго грунтоўным веданьні патрэбаў краю, а таксама — ў яго пашане да закону. У Польшчы і так—зашмат „чыньнікаў бязладу", каб да лічбы гэтых чыньнікаў яшчэ далучыўся ўрад".

Прамова віцэ-прэм. толькі ўзмоцніла становішча клюбу—ў выражэньні недаверыя ўраду.

Прадстаўнік немцаў так сама востра крытыкаваў прамову мін. Бартля.

Хадэк Бітнэр адрозьнівае „тон і зьмест прамовы" віцэ прэм'ера. Аб — „зусім недапусьцімы тоне прамовы ў адносінах да парляманту з боку міністра" пасол ня хоча гутарыць, тлумачучы гэты „тон" толькі — хваробай п. Бартля. Далей ён казаў тое ж, што п. Гломбіньскі: волю народу выражае Сойм, але ня ўрад; калі ўрад не згаджаецца з Соймам, дык можа — або выйсьці ў адстаўку, або—распусьціць Сойм. Але, замест гэтага урад імкнецца да спараліжаваньня волі Сойму, заяўляючы адначасна, што — „не вядзе барацьбы з парлямантам". Урад ня хоча выкінуць тых міністраў, якім Сойм ужо выразіў пасрэдна ці беспасрэдна сваё недаверые. „Палітыка спраціву волі 6 мільёнаў выбаршчыкаў Краю, прадстаўленых у Сойме, прывядзе Польшчу зусім не да падпарадкаваньня волі „слабай кучкі прыхільнікаў віцэ міністра, але да панаваньня—камуністаў.

Старшыня Дашыньскі робіць увагу аратару, што ён закінуў віцэ прэм'еру—„няпоўную пачытальнасьць", чаго рабіць ня можна.

Пэпэзсавец Яворовскі востра крытыкуе становішча мін. Бартля ў справе самаўрадаў. Віцэ-прэм'ер высказаўся наагул проці праектаў самаўрадавай камісіі тады, калі яе праца была амаль-што ня скончана. Чаму-ж ён ня прышоў у камісію сказаць усё тое, што ён казаў цяпер?! Ці-ж у гэтым запраўды ёсьць шчырае жаданьне „прысьпешыць справу самаўрадаў у Польшчы"?.

Мін. Бартэль высказаўся проці аднолькавых самаўрадавых законаў для ўсяе Польшчы. Ці-ж гэта значыць, што ён ня хоча, каб у незалежный, аб'яднанай Польскай дзяржаве было сваё аднолькавае законадаўства, але наадварот—асталіся—тры розныя законадаўствы ўсіх трох „заборчых манархіяў"?. Міністар высказаўся проці дэмакратычнага выбарнага закону ў самаўрады. — „Не разумеем мы, як гэта можа сябра ўраду самага Марш. Пілсудскага, у габінэце якога сядзіць сам мін. таварыш Морачэвскі, нападаць у сваіх прамовах на дэмакратычнае выбарнае права ў самаўрадах".

Дагэтуль яшчэ пэпэсы — „не зразумелі". Ну, для нас дык гэта даўно ўжо ясна: хаця-б ад уваходу п. Мэйштовіча ў склад ураду „самога Марш. Пілсудскага"!..

Д-р Ян Бассановіч.

Яшчэ так нядаўна літоўскае грамадзянства ўрачыста сьвяткавала падвойны юбілей д-ра Яна Бассановіча—75-лецьце ўрадзін і 50 лецьце грамадзкае працы; так нядаўна гаварыліся гарачыя прывітальныя прамовы да Яго—жывога... А вось сяньня мы прымушаны пісаць аб гэтым найвыдатнейшым з павадыроў адраджэнскага руху сярод літвіноў, як аб нябожчыку, як аб тым, хто быў, тварыў, працаваў і вось ўжо перайшоў на страніцы гісторыі...

Імя д-ра Бассановіча — гэта быццам сьцяг, за якім у працягу паўсотні гадоў ішлі літоўскія адраджэнцы. З яго імем зьвязана першая літоўгазэта „Aušra", выдаваная ў Тыльжы (ў Прускай Літве) ад 1883 году. З яго пачыну адбыўся ў 1905 годзе ў Вільні вялікі ўсе-літоўскі зьезд, які да лёзунгаў расейскае Рэвалюцыі далучыў лёзунг аўтаноміі Літвы. Ён-жа — бацька літоўскае Навукі, закладчык Літоўскага Навуковага Т-ва ў Вільні, аўтар чысьленых навуковых прац і досьледаў у літоўскай мове. І ўся гэтая дзеяльнасьць Яго—гэта-ж падстава, на якой вырасла сучасная Літва, як незалежнае гаспадарства.

Дык тым вялікшы сум мусіў агарнуць літоўскае грамадзянства, што сьмерць яго ідэйнага Павадыра выпала акраз на ўрачысты дзень сьвяткаваньня 10 лецьце незалежнасьці Літвы (16-га лютага).

Шчыра спагадаем братняму Літоўскаму Народу з прычыны ўтраты Сына Літвы, які ўсё жыцьцё сваё аддаў на служэньне роднаму Краю.

У Польшчы.

Нямецкі пас. Раўшэр у марш. Пілсудскага.

18 лютага нямецкі пасол Раўшэр меў 3-гадзінную гутарку з марш. Пілсудскім — у справе ўзнаўленьня польска-нямецкіх перагавораў. Пасьля візыты пасла марш. Пілсудскі запрасіў да сябе мін. Залескага, з якім канфэраваў 2 гадзіны. Назаўтра паехаў сам да хворага віцэ-прэм. Бартля, гутарыў доўга і з ім, а пасьля — з мін. унутраных спраў Складкоўскім.

У палітычных колах кажуць, быццам нямецкі пасол — згодна з пастановай нямецкага ўраду — запрапанаваў польскаму ўраду ўзнаўленьне перагавораў аб заключэньні гаспадарчага трактату, але толькі—пасьля вырашэньня справы сталага асяданьня нямецкіх грамадзян у Польшчы.

Канфлікт ураду з Сэнатам.

Юрыдычная камісія Сэнату прыняла вострую рэзалюцыю проці пастановы ўраду, які прызнаў неабавязковым для сябе даваць адказы на запытаньні і інтэрпэляцыі, пададзеныя ў папярэднюю сэсію Парляманту. Сэнат прызнаў гэтую пастанову ўраду супярэчнай з Канстытуцыяй. Дзеля таго камісія зварачаецца да ўраду, каб той даў адказы, вымаганыя сэнатарамі.

Рэзалюцыя камісіі прынята пленумам Сэнату 16 лютага.

Новы дэкрэт.

„Урад працы" мае спарадзіць новы дэкрэт. Дэкрэт мае даць новую арганізацыю адміністрацыйным уладам I і II інстанцыі (староства і ваяводзтва). Як пішуць газэты, арганізацыя адміністрацыі мае быць „арыгінальная польская", толькі — зусім падобная да тэй, якая да вайны істнавала ў.. Прусіі.

Бяруцца і за работніцкае заканадаўства.

Магутныя прамыслова-абшарніцкія колы, якія маюць такія вялікія ўплывы на сучасны ўрад Мэйштовіча-Морачэвскага, даўно імкнуцца выкарыстаць сваю сёньняшнюю сілу—дзеля скасаваньня хаця-б часткі так-званых работніцкіх сацыяльных здабычаў—законадаўства аб ахове работнікаў (8-гадзінны дзень працы, касы хворых і г. д.). Навет Ул. Грабскі пакляўся захаваць нятыкальным гэтае работніцкае законадаўства ў Польшчы, баючыся, што пэпэзсы адмовяцца ад падтрыманьня яго ўраду. Цяпер, калі пэпэзсы значна больш „даюць у крэдыт" новаму ўраду,

робіцца значна больш магчымым тое, што было быццам зусім немагчыма да „траўня“...

На апошнім паседжаньні соймавай камісіі „аховы Працы“ правіца падняла справу перагляду закону аб касах хворых. Прысутны на паседжаньні прадстаўнік міністэрства працы заявіў, што ўрад апрацоўвае і хутка окончыць новы законапраект аб Касах Хворых, у якім будуць зьмешчаны адразу і ўсе іншыя законы аб сацыяльнай ахове работнікаў. Праект мае быць у хуткім часе разасланы ўсім „гаспадарчым арганізацыям“ — дзеля разгляду і крытыкі.

Гэтая заява выклікала вельмі вострую дыскусію ў камісіі. Навакол праекту узгарыцца вострая барацьба, да якой рыхтуюцца ўжо пэпээсы. Але—ці яны пераможуць уплывы „гаспадарчых колаў“, якія кіруюць урадам,—вельмі сумліўна!

Абшарнікі-цукравары самавольна паднялі цану цукру.

Цэнтраля саюзу польскіх абшарнікаў-цукравараў выслала віцэ-прэм'еру Бартлю пісьмо з паведамленьнем аб значнай падвышцы гуртовай цаны на цукар. Гэтае „паведамленьне“ — асабліва цікаўнае на „нашы стасункі“, бо толькі-што ўрад станоўча не згадзіўся на дамаганьні цукравараў і гуртаўнікоў на гэтую падвышку.

Што будзе рабіць цяпер „урад працы“ (выражэньне мін. Бартля аб сваім урадзе), які даўно ўжо апанаваны абшарнікамі, — паглядзім!

Безрабоцьце на Сьлёнску расьце.

За мінулы справаздаўчы тыдзень лічба безработных на Горным Сьлёнску павялічылася на 506 душ і дасягла 46.578 асоб.

Спадзяюцца далейшага росту безрабоцьця з прычыны канфлікту між работнікамі і прамыслоўцамі. Апошнія зракліся надалей агульнае ўмовы аб найме работнікаў, адмовіўшыся адначасна ад павялічэньня платы.

„Хваляваньне сярод чыгуншчыкаў“.

Пад такім загалоўкам „Роботнік“ паведамляе:

„З прычыны адмовы з боку ўраду падвысіць пэнсіі чыгуншчыкам, сярод іх пачалося паважнае хваляваньне, якое ўсілілася яшчэ пасьля таго, як соймавая большасьць адкінула прапазіцыі пасла Пончка аб сталых дадатках на дарагоўлю (так званая „множная“). Пад уплывам гэтых непамысных вестак адбыўся, як піша газэта, рад мітынгаў работнікаў на чыгунцы, „выразілі пратэст проці таго, што ўрад не зьвяртае ўвагі на дамаганьні працаўнікоў“.

Тое-ж пацьвярдже „Rzeczpospolita“.

Забастоўкі ў Лодзі.

15 лютага ў Лодзі пачалася забастоўка зецэраў. Забастоўка мае выключна эканамічны грунт — барацьбу за лепшыя заробкі.

Спадзяюцца такжа забастоўкі ткацкіх работнікаў.

Умысловыя працаўнікі—разам з фізычнымі работнікамі.

У Лодзі ў барацьбе за паляпшэньне быту аб'ядналіся арганізацыі ўмысловых працаўнікоў з праф. саюзамі фізычных работнікаў. Мае быць супольна распачата барацьба за павялічэньне заработкаў на 25%.

Ці атрымае Польшча пазыку з Амэрыкі?

Некаторыя газэты—ў зьвязку з падарожжай польскай дэлегацыі ў Амэрыку—пускаюць прадыктаваныя ім чуткі, быццам рэалізацыя пазыкі для Польшчы — блізка. У паважных фінансавых колах сцьвярджаюць наадварот, што канкрэтнага рашэньня ў гэтай справе ня можна спадзявацца раней, як—за паўгоду.

Заграніцай.

Англійскі націск на Літву.

Нядаўна мы падалі вестку аб візыце англійскага пасла ў прэзыдэнта Літоўскай Рэспублікі. Англійскі пасол быццам вельмі націскаў на Літву, каб мірылася з Польшчай... Цяпер газэты пішуць, быццам Англія мае фармальна і яўна запрапанаваць Літве і Польшчы сваё пасрэдніцтва ў справе прымірэньня...

Ведама-ж, што гэткія фармальныя адкрытыя прапазіцыі пасрэдніцтва з боку такіх „вялікіх павагаў“ робяцца толькі тады, калі ўжо грунт аканчальна падгатаваны ў цішы дыпляматычных габінэтаў... А вось толькі-што зьявілася ня менш цікаўная вестка. Францускі ўрад паслаў у Коўну і свайго „паўнамоцнага пасла“ — замест быўшага дагэтуль праз увесь час „міністра-рэзыдэнта“. У сваей прамове на прадстаўленьні прэзыдэнту Смэтоне францускі пасол з вялікім націскам радзіў літоўскаму ўраду ісьці шляхам міру з сваімі суседзямі, што перадусім карысна для самае Літвы...

Газэты пішуць, што Францыя, пасылаючы свайго асабліва важнага пасла ў Літву, хоча таксама прылажыць сваю руку да паразуменьня Літвы з Польшчай, якое быццам ужо даканаў уплыў Англіі...

Усё гэта вельмі цікаўна наагул — для англійскай палітыкі, якая, — як пішуць усе галасьней, — рыхтуе нешта „рашучае“ на Усходзе Эўропы...

Ня менш характэрнай азнакай зьмены палітычнага кірунку ў Літве зьяўляюцца чуткі аб звальненьні прэзыдэнтам (можа — англійскім пасломʔ!) сучаснага цывільнага прэм'ера літоўскага ўраду, прафэсара Вальдэмараса, і аб назначэньні — „камандзірам“ літоўскага ўраду—сучаснага начальніка генаральнага штабу, палкоўніка Даўконта...

Арыштаваньне сацыялістаў у Літве.

Як і трэба было спадзявацца, пасьля разгрому камуністаў у Літве прышоў чарод на сацыялістаў. Апэтыты фашыстаўскага ўраду растуць аднолькава — як у Італіі, так і ў Літве, ці—дзе інш.

Проціпольская прамова павадыра нямецкіх нацыяналістаў.

Як ведама, пад націскам нямецкіх нацыяналістаў, якія прадстаўляюць найсільнейшую групу ў нямецкім урадзе. Нямеччына аб'явіла рашучую гаспадарчую вайну Польшчы. Толькі-што павадыр гэтых нацыяналістаў, граф Вэстарп, фактычны кіраўнік новай нямецкай палітыкі на ўсходзе, сказаў на зьезьдзе Нямецкага Крэсавага Саюзу ў Піле прамову, у якой падробна нарысаваў гэтую палітыку Нямеччыны на Усходзе.

Уваход у Лігу Народаў даў Нямеччыне магутнае аружжа дзеля аховы правоў нямецкіх меншасьцяў у іншых дзяржавах. Гэтае права Нямеччына лічыць галоўнай падставай для сваей дзяржаўна-нацыянальнай сувэрэннасьці (прасьцей кажучы: гэта дае Нямеччыне права і магчымасьць лічыць усіх немцаў, а ня толькі немцаў у Нямеччыне, „грамадзянамі нямецкай нацыі“ і апекавацца імі ўсімі, як быццам грамадзянамі Нямецкай Дзяржавы)... Гэта прызнанае Нямеччыне права дае ей магчымасьць вясьці ў Лізе барацьбу з Польшчай, якая больш за ўсіх крыўдзіць „грамадзян нямецкай нацыі“ ў сябе, парушаючы ўсьцяж пастановы падпісаных ею Трактатаў. Аб разьмерах нямецкай крыўды ў Польшчы сьведчыць паміж іншым тое, што ў адным толькі Паморыі 80% адабранай пад зямельную рэформу зямлі ўзяты ад немцаў. Нямецкія нацыяналісты цалком бяруць на сябе адказнасьць за аб'яўленьне гаспадарчай вайны Польшчы. Нямецкая палітыка павінна імкнуцца да поўнай гаспадарчай і палітычнай ізаляцыі (адасабленьня) Польшчы. Немцы ў Лёкарно рашуча адкінулі загарантаваньне польскіх усходніх граніц, і ўсе спробы з боку Францыі і Польшчы дабіцца гэткай гарантыі павінны спаткаць рашучы адпор з боку Нямеччыны...

Нямецкая прэса аб сарваньні польска-нямецкіх перагавораў.

Нацыяналістычная прэса з трыўмфам вітае аб'яўленьне гаспадарчай вайны з Польшчай, трэбуючы далейшых мераў—да поўнага зачыненьня польска-нямецкай граніцы для польскай таргоўлі, і—рашучых рэпрэсіяў у адносінах да палякоў у Нямеччыне — у адказ на ўціск немцаў у Польшчы. Больш умераная газэта „Deutsche Allgem. Ztg.“ піша, што вясьці перагаворы з дзяржавай, якая па спосабу сярэдніх вякоў трактуе ня толькі нямецкіх грамадзян, але-ж і сваіх уласных грамадзян нямецкай нацыянальнасьці, ня мае ніякага сэнсу. Дэмакратычная прэса — больш стрыманая; яна абураецца на немагчымы тон нацыяналістычных газэт, якія „называюць Польшчу бандыцкай, паразітнай дзяржавай“,—бо-ж гэта ня можа давясьці да паразуменьня...

Чэха-Славакія мае афіцыяльна прызнаць радавую ўладу.

Пражскія газэты пішуць, што чэха-славацкі ўрад зусім ужо падгатаваў афіцыяльнае прызнаньне Радавай Расеі. Гэтая пастанова пражскага ўраду выклікана ўсё пашыраючымся таргобым абменам між абыдвума краямі, якому вельмі перашкаджае ненармальны юрыдычны стан адносінаў між імі. Абодва краі зракаюцца ўзаемна ўсялякіх грашовых прэтэнсіяў (адшкадаваньняў і г. д.), што было дагэтуль адным з галоўных прадметаў спораў.

Капітуляцыя Англіі перад Радамі.

Пасьля пагражаючых прамоваў і заяваў самых уплывовых англійскіх міністраў, англійскі ўрад пастанавіў—ня зрываць адносінаў з СССР і не высяляць з Англіі яго прадстаўнікоў,—„каб не завастрыць адносінаў з СССР“.

Расправа з паўстанцамі ў Партугаліі.

Пасьля злушэньня паўстаньня ўрадам, пачаліся распpавы палявых судоў з павадырамі паўстаньня. Адзін па адным яны засуджываюцца на сьмерць. Адначасна ідзе рашучая фашызацыя ўсяго ладу ў краю. — Дыктатар, забіўшы ўсю актыўную апазіцыю ў краі, дый яшчэ апіраючыся на магутную падмогу англійцаў, можа рабіць, што толькі захоча (ці—што прыкажуць яму англійцы!)

Проці-англійскі кангрэс у Брусэлі.

У Брусэлі (Бэльгіі) распачаў працу кангрэс цаняволеных народаў, на якім пераважна прадстаўлены народы Азіі. Дыскусія амальня выключна мела мэтай стварэньне—проці-англійскага фронту ўсіх азіяцкіх народаў.

І Партыя Працы—проці вайны.

Нацыянальная Рада англійскай Партыі Працы пастанавіла зацьвярдзіць пратэст свайго пасольскага клюбу ў парляманьце—проці аружнага ўмяшацельства англійскага ўраду ў кітайскую хатнюю вайну і трэбаваць перадачы справы канфлікту між Кітаем і дзяржавамі—Лізе Народаў.

Агульная забастоўка кітайскіх маракоў.

У зьвязку з проці-англійскім рухам у Кітаі, павадыры кітайскіх маракоў арганізуюць агульную забастоўку кітайскіх матросаў на ўсіх англійскіх караблёх.

Генаральная забастоўка ў Шанхаі.

Па загаду аб'яднанай кітайскай работніцкай партыі распачалася ў Шанхаі 19-га лютага генаральная забастоўка ўсіх работнікаў — у знак пратэсту проці высадкі англійскіх войскаў, дый дзеля выражэньня спагаду кантонскаму ўраду. Шанхайскія работнікі трэбуюць, каб англійскія і кітайскія войскі (ген. Сун-Чуан-Фанга) пакінулі Шанхай.

Англія афіцыяльна пацьвярджае разгром арміі Фанга.

Англійскае агенства афіцыяльна пацьвярдзіла вестку аб разгроме арміі ген. Сун-Чуан Фанга, які йдзе з Чанг-Тсо Лінам Гэткім чынам шлях да Шанхаю—зусім адкрыты для кантонскай арміі. 19-га лютага чырвоная армія была ў адлежнасьці толькі 2 дзённых пераходаў ад Шанхаю. Дык калі газэта дойдзе на месцы, Шанхай будзе ўжо абложаны паўкругам чырвонай арміяй, якая — калі не

Школьныя інспэктары «дбаюць» аб беларускую школу.

Заява сялян вёскі Лук, Жухавіцкае гміны, Стаўпецкага пав., да Галоўнае Управы Таварыства Беларускае Школы.

„Мы, сяляне вёскі Лук, Жухавіцкае гм., Стаўпецкага пав., праз свайго паўнамоцніка Андрэя Тананко, 27 сьнежня склалі дэкларацыі пану інспэктару ў Стоўпцах на беларускую ўрадавую школу ў ліку 38 на 50 дзяцей. 2 лютага гэтага году ў гэтай справе прыехаў да нас у в. Лукі пан інспэктар і загадаў заступніку солтыса Цімоху Крапіўніцкаму, каб ён паклікаў ніжэйпамянёных сялян у ліку 10 асоб наступных:

1) Навума Забенко — 1 дз., 2) Цімоха Тананко—1 дз., 3) Астапа Булдыка — 2 дз., 4) Андрэя Хіневіча—1 дз., 5) Даніла Хіневіча—1 дз., 6) Мікалая Бугляка — 1 дз., 7) Адама Тананко — 2 дз., 8) Васіля Елака — 1 дз., 9) Мікалая Немарскага—2 дз., 10) Мікіту Максімовіча—2 дз.

Калі мы прышлі да пана інспэктара, то ён па аднаму выклікаў нас і даваў нашы дэклярацыі, што мы падавалі на беларускую школу і казаў, каб мы на іх расьпісваліся на адвароце, гдзе ня было нічога напісана, што мы і зрабілі з увагі на тое, што гэта нашы дэкляроцыі і што мы запраўды жадаем беларускае школы і тым болей, што мы падпісваліся на зусім чыстым баку дэкляpацыі. Пасьля гэтага інспэктар паклікаў і ўсіх астальных дэклярантаў і жадаў, каб і яны расьпісаліся, але тыя адмовіліся.

Бяручы пад увагу тое, што пан інспэктар можа напісаць на адвароце дэклярацыі, дзе мы падпісаліся, што захоча, а асабліва, што мы быццам не жадаем беларускае школы, то мы ніжэйпадпісаныя дэкляранты просім Галоўную Управу Т-ва Беларускае школы зрабіць захады перад адпаведнымі ўладамі, каб нашы подпісы на адвароце дэклярацыі лічыла няважнымі і стараліся адчыніць Беларускую школу ў в. Луках.

(Ідуць дзесяць подпісаў успомненых сялян).

Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы падае да агульнага ведама гэты красамоўны факт, зазначаючы, што ніякія інспэктары ня маюць права дамагацца ад дэклярантаў падобных подпісаў. Разам з тым Галоўная Управа перасьцерагае ўсіх склаўшых дэклярацыі на ўрадавую беларуску школу перад падобнымі крокамі інспэктароў ці адміністрацыі наагул і ведаючы, што падобнае будзе паўтарацца ня раз, радзіць у такіх выпадках ня слухаць іх, а прытрымоўвацца інструкцый Галоўнай Управы. На ўсіх жа тых паноў інспэктараў, што ашуканствам хочуць адбіць наш народ ад роднае школы, падае скаргі ў адпаведныя вышэйшыя ўстановы з дамаганьнем наказаць іх за ашуканства.

Ляо-Дзэ.

На берагох Янг-Тэз-К'янгу.

(Апавяданьне з сучаснага кітайскага жыцьця).

Ван Тсун устаў і, падабраўшы полы свайго халату, пайшоў за храмым.

Доўга ішлі яны рознымі крывымі і бруднымі вуліцамі спаўшага ціха Вучана. Разы са два папалася ім наўсьпярэйму ваенная варта. Чуткі храмы заўважаў яе аднак заўсёды ўпару. Прытаіўшыся дзе небудзь каля будыніны, прапускалі яны тады яе міма і йзноў ціха, быццам якіясь духі, ішлі ўперад.

Прайшла добрая гадзіна часу, пакуль яны дабраліся да сваей мэты. На дадзены храмым умоўны знак скрыпнулі ціха дзьверы невялікага доміку, і яны апынуліся ў набітай людзьмі душнай хапе. Слабенькае сьвятло невялічкай лямпачкі дадавала гэтаму начному таямнічнаму сходу нейкай захопліваючай велічы, а пачуцьцё адказнасьці надавала кожнаму прысутнаму павагі і сур'ёзнасьці.

Споўніўшы неабходную да апошняга часу ў жыцьці кітайцаў цэрэмонію прывітаньня, заняў Ван-Тсун паказанае яму месца, абвёў вачыма прысутных, і сэрца яго забілася радасьцю.

Прад ім стаялі закураныя і апаленыя ў сталёвых гутах работнікі, сагнутыя цяжкой працай у доках чужаземных канцэсіяў кулі, высахшыя, як шчэпкі, сартаўшчыкі і ўпакоўшчыкі гарбаты, дробныя галодныя земляробы і агароднікі, розны рамесны люд, некалькі навет народных вучыцялёў і прадстаўнікоў іншых прафэсіяў. Усіх іх сабрала сюды пачуцьцё неабходнасьці змаганьня за сваё права на жыцьцё і глыбокае перакананьне, што сіла і перамога працоўных масаў усяго сьвету—толькі ў іх еднасьці і салідарнасьці.

Ван-Тсун пабачыў, што, чакаючы на яго прыход, яны пасьпелі шмат аб чым пачаварыць, многа чаго абрадзіць і цяпер чакалі, што скажа ім ён, прадстаўнік народнай Кантонскай арміі,—чакалі, чаго ад іх зажадае ці навет што ім загадае.

Ён пачаў гаварыць. Словы яго паліліся і паплылі гучна, складна. Ён гаварыў, ня думаючы аб тым, што гаварыць і як гэта скажа—добра ці блага, — а проста і шчыра, так як яму гаварыла яго душа, як білася яго сэрца. Хутка ён навет перастаў чуць сваю гаворку; ён толькі ўжо бачыў, як з кожным сказаным ім новым словам твары прысутных усё больш і больш загараюцца агнём, вочы блішчаць усе ярчэй і ярчэй.

У Эўропе і Амэрыцы бачыў Ван-Тсун сходы і зьезды работніцкіх саюзаў і партыйных арганізацыяў, бачыў маніфэстацыі „патрыётаў“ за вайну, прыглядаўся да мітынгаў і дэманстрацый проціў яе, перажыў некалькі работніцкіх забастовак. Ён ведаў, як і калі загараюцца вочы людзкія, калі і што ў іх сьвеціцца. Такі аднак агонь, які гарэў цяпер у вачах прысутных перад ім людзей, ён бачыў рэдка.

Гэта ня быў агонь дзікога, нічога ня церпячага, апрача сваей дурнаты і дзікасьці, фанатызму: агонь гэты гарэў і іскрыўся пашанай да кожнай працоўнай адзінкі, да тых, хто ня хочуць жыць паразытам з працы, сьлёз і поту чужога. Гарэў і сьвяціўся гэты агонь аднолькава сьветла і радасна, як для работніка кітайца, так і для работніка ангельца, амэрыканца ці навет нэгра.

Радасна было бачыць гэта Ван Тсуну. Праца лепшых сыноў Кітайскага народу, народу, які за многа сот гадоў да Хрысьціянскай эры вуснамі сваіх прарокаў высказаў і аформіў шмат такога, да чаго і сяньоньня не дарасло яшчэ хрысьціянства,—дарма не прапала: Кітай знайшоў новую веру—загарэўся новым дзіўным агнём.

І хацелася ў гэты момант Ван-Тсуну, каб гэты агонь запылаў над усім сьветам, каб ён асьвяціў і сагрэў усіх скрыўджаных і ашуканых, каб у гэтым агні пераплавілася і згарэла ўсё дзікае дзяленьне людзей на расы і веры, на лепшых і горшых, каб пасьля яго ня было на сьвеце ані жоўтых ані белых, хрысьціян і буддыстаў бедных і багатых: усе каб былі толькі людзі, усе каб сталі жыць з сваей працы, а ня з вызыску сабе падобных.

— „Таварышы“! — прагаварыў ён: „я рад, што наш Народны ўрад у Кантоне выбраў гэту дарогу... Кітайскі народ мусіць скінуць з свайго карку ганебнае ярмо вызыску і ганьбы“!..

— „Скінем“!.. адказалі ўрачыста і цьвёрда ўсе прысутныя ў адзін голас.

— „Змаганьне вымагае вялікіх ахвяр... Многа хто ў ім згіне, многа хто перанясець вялікія мукі—ня столькі ад белых, сколькі ад іх наймітаў—Чанг-Тсо-Ліна і іншых. Ці гатовы вы на гэта“?..

— „Сьмерць нам ня страшна, а страціць мы ня маем нічога“... адказалі прысутныя.

— „На дарозе Народнай арміі стаіць цяпер Ганкаў з Ган'янам і Вучангам; ён мусіць стацца народным горадам!.. Народная армія чакае вашага голасу, просіць вашай падмогі, бо адна яна ўзяць яго ня зможа“...

— „Паможам!.. Ганкаў разам з канцэсіямі будзе народным горадам“!..

Уся ноч прайшла сабраўшымся ў нарадах. І толькі пад дзень, калі ўжо пачынала сьвітаць, прысутныя, як цені, незаўважна, па адным высьлізнуліся на двор і рассыпаліся ўва ўсе бакі, каб па магчымасьці яшчэ ў гэты ж дзень перадаць сваім таварышам усё тое, што яны чулі ад пасланца Народнай арміі, Ван-Тсуна.

Сам Ван Тсун выйшаў апошні; той-жа храмы, які прывёў яго сюды, праводзіў яго і назад. Усё спачатку ішло добра. Хаваючыся каля хат, прайшлі яны Вучанг і ўжо хацелі выйсьці на бераг Янг-Тзэ-К'янгу, як раптам чуткая вуха храмога ўлавіла якісьці шорах за вуглом суседняй хаты.

— „Назад тут схаваўшыся варта“!, — шапнуў ён Ван-Тсуну, цягнучы яго за рукаве за вугал суседняга дому.

Было, аднак, ужо позна: варта іх заўважыла і кінулася лавіць.

— „Стой!.. стой!.—будзем страляць“!— крычалі вартаўнікі, даганяючы іх.

Ані храмы, ані Ван-Тсун аднак іх ня слухалі і рознымі закавулкамі беглі ўперад. Скора лянівая варта пачала заставацца ззаду; яшчэ хвіліна—і яны шмыгнуць кудысь у вароты.

Аднак, лёс сягоньня ня спрыяў Ван-Тсуну. Ён спаткнуўся раптам аб камень і грукнуўся аб зямлю. Хруснула галёначная косьць, нага забалела і занылa, і Ван-Тсун чуць ня страціў прытомнасьці.

— „Уцякай хоць ты сам“! — сказаў ён скочыўшаму да яго на помач храмому: „Усё роўна мяне ўжо ня выратуеш“...—І сьцяўшы ад болі зубы дастаў з кішані браўнінг.

— „Хто падняў сьцяг за свабоду працоўных мас і Кітаю, той сябру свайго ў небясьпецы ніколі ня кіне“, адказаў яму цьвёрда храмы, выхапіўшы з кішані малень-

згаворацца дзяржавы з Кантонам — можа ўдэрыць на іх няпрошаныя палкі ды батальёны.

Сілы чужынцаў пад Шанхаем.

Аружныя сілы чужаземных войскаў у Шанхаі—гэткія: англійскіх—8.000 жаўнераў, амэрыканскіх—3.500, францускіх—1 500. Лічба вялікшых ваенных караблёў у шанхайскім порце—26.

Нямеччына будзе нэйтральная ў канфлікце між Кітаем і Англіяй.

Міністар замежных спраў Нямеччыны рашуча запярэчыў чуткам аб быццам праектаваным аружным выступленьні Нямеччыны — побач з Англіяй — у Кітаі. Штрэзэман загадаў усім прадстаўнікам Нямеччыны заграніцай рашуча запэўніць усе ўрады, што Нямеччына захавае ў справе кафлікту поўны нэйтралітэт.

Амэрыка адкрыта захоплівае рэспубліку Нікарагуа.

Амэрыканскі ўрад паслаў у Нікарагуа яшчэ паўтары тысячы войска—на помач прэзыдэнту Дыяцу, прадаўшаму край амэрыканскай буржуазіі. „Каб спыніць хатнюю вайну ў Нікарагуа“, амэрыканскі ўрад мае абвясьціць усю рэспубліку Нікарагуа „нэйтральнай“. Але адначасна дае загад сваім войскам — біць вызваленчую армію ген. Сакассы. Гэткая тактыка Паўночна-Амэрыканскіх Штатаў выклікае страшэннае абурэньне ў Сярэдняй і Паўдзённай Амэрыцы.

Аб чым пішуць.

Канкурэнты?!

„Кур. Віл.“ у № 38 з 17 лютага надрукаваў дужа цікаўную перадавіцу, у якой чытаем:

> Асноўнай мэтай адміністрацыйных рэпрэсіяў ў адносінах да беларускае Грамады было імкненьне да зьліквідаваньня процідзяржаўных настрояў, якія сярод сялянства Усходніх Зямель узрасталі з стыхійным размахам. Сяньня можам ужо з усей рашучасьцяй сьцьвярдзіць, што мэта гэтая не дасягнена. Весткі, якія надыходзяць з правінцыі, кажуць, што беларускі селянін, хоць ня раз запалоханы пагрозай рэпрэсіяў, у глыбіні душы адчуў факт арышту грамадаўскіх паслоў, як доказ перасьледаваньня Польшчай беларускага руху. Шмат дзе сяляне гавораць спагадна аб цяжкім лёсе „нашых паслоў“. Гэтак тыя, хто ў вачох польскага грамадзянства зьяўляецца праступнікам і здраднікам, у вачох тутэйшай люднасьці ў чысьленых выпадках стаюцца гэроямі, якія пакутуюць за праўду“.

Якімі-ж спосабамі можна — на пагляд польскіх „дэмакратаў“—дасягнуць тае мэты, дзеля якое ўзьняўся паход проці Грамады і грамадаўскіх паслоў? „Кур. Віл.“ радзіць наступнае:

> „Беларускі рух—кажа газэта—зьяўляецца сяньня пэўнай грамадзкай сілай — незалежна ад таго, ці нам гэта падабаецца, ці не. Дык інтарэсы польскае дзяржаўнасьці вымагаюць, каб уплыў у гэтым руху мелі перадусім тыя групы, якія склонны да пэўнага паразуменьня і супрацоўніцтва з Польшчай“.

Паны „дэмакраты“, ведама, не адважаюцца ўжо гаварыць паважна аб тых „дэфэнзыўных“ беларускіх арганізацыях, да якіх належаць розныя Павлюкевічы, Валэйшы, Мамонькі і іншыя падобныя тыпы. Паны „дэмакраты“ баяцца запэцкацца аб іх! Але—не бяда: ёсьць ужо „ідэйныя“ групы, гатовыя на ўсялякія палітычныя спэкуляцыі:

> „Сяньня мы маем дзьве паважныя беларускія групы, склонныя да паразуменьня з Польшай. Гэта—„Сялянскі Саюз“ і хрысьціянскія дэмакраты. Групы гэтыя маюць шмат меншыя ўплывы, чым Грамада, — мо' якраз затым, што ў адносінах да настрояў масы—не даволі радыкальныя. Узмацненьне іх уплываў — гэта адзіны спосаб паніжэньня „грамадаўскіх“ настраеньняў“.

Ксяндзоўская „Бел. Крыніца“ не запярэчыла гэтай заяве польскіх „дэмакратаў“, а толькі ў стацьці з 18 лютага паставіла свае варункі, на якіх магчыма „паразуменьне і супрацоўніцтва“ хадэкаў з Польшчай. Падгалосак-жа яе—„Сялянская Ніва“—нібы-то пярэчыць, але ў такой „далікатнай“ форме, у якой ня прывыкла адказваць, прыкладам, нам. Для яе словы „Кур. Віл.“ зьяўляюцца не „бандытызмам“, ці „ілжой“, як ксяндзоўскія газэты адказваюць нам на выкрываньня машэнствы хадэцка сельсаюзьніцкай кумпаніі,—а толькі „дзіўнымі“:

> „На падставе якіх фактаў аўтар таго артыкулу зрабіў вывад, што „Сялянскі Саюз“ „склонны“ да паразуменьня з польскім урадам“?

У гэтым далікатным запытаньні, запраўды-ж, трудна навет і запярэчаньне дагледзіць! Дык ня дзіва, што дасюлешнія адзіныя сярод беларусаў „казённыя полёнофілы“ з павлюкевічаўскага „Беларускага Слова“ дужа паважна занепакоіліся, бачучы ў хадэках і сельсаюзьніках — сваіх канкурэнтаў! Згэтуль—вострая лаянка — зусім у стылю ксяндза Станкевіча, запраўднага павадыра і хадэкаў і сельсаюзьнікаў:

> „Мы перад тварам усяго беларускага грамадзянства заяўляем,—піша „Бел. Слова“, што Сельсаюз напаў на нас за нашае жаданьне дагаварыцца з урадам марш. Пілсудскага і польскім грамадзянствам **толькі пасьля** таго, як сельсаюзьнікі за сваю непрызваітасьць, глупоту і нахальства падчас перагавораў аб **канцасіях для сябе** з гэтымі-жа польскімі чыньнікамі, атрымалі замест канцэсіяў—каленам“...

Дык такі былі нейкі перагаворы аб „канцэсіях для сябе“, ці не?! З заядласьці і страху Павлюкевіча, што ён і яговыя кумпаны могуць страціць канцэсію на шулерню — ў пастаці „Беларускае Хаткі“, у каторай — паводле „Бел. Слова“—„безработныя віленскія беларусы дастаюць кусок хлеба“,—трэба думаць, што-ткі нешта—„за кулісамі“—было.... Бо-ж інакш, запраўды, трудна зразумець, чаму гэта абедзьве ксяндзоўскія газэты — „Бел. Крыніца“ і „Сялянская Ніва“, якія дагэтуль заўсёды далікатна адносіліся да павлюкевічаўска-валэйшаўскае банды (Валэйша-ж—кум Ярэміча!)—раптам пасварыліся з ею, хоць адначасна ўвялі ў сваю кумпанію ня меншага, чым Павлюкевіч, „полёнофіла“ Дубейкоўскага?!

Усё вінавата канкурэнцыя!

Да грамадзян, склаўшых дэкляряцыі.

1. Грамадзяне! Ужо пачынаецца тое, што было і ў леташнім годзе. Ізноў Школьныя Інспэктары з войтамі, або паліцэйскімі езьдзяць па вёсках і вымагаюць ад бацькоў узяць назад дэклярацыі, або падпісаць якія-сь то пратаколы. Грамадзяне, пакажыце сваю грамадзкую сьвядомасьць! Разьбірайцеся добра ў тым, што робіце. Калі Вам дадуць падпісаць якую-сь незразумелую паперку, то паклічце чалавека, якога добра ведаеце. Няхай ён Вам растлумачыць, што яна азначае і тады ўжо будзеце бачыць, ці трэба расьпісвацца, ці не. За подпісы на дэкляряцыях ня бойцеся, бо Вы паступілі так, як вымагае закон аб школьніцтве і Ваша бацькоўскае сумленьне.

Памятайце, што калі Вы возьмеце назад дэклярацыі, то не дасьце сваім дзеткам вучыцца ў роднай мове.

2. Калі каго ўжо змусілі забраць назад дэклярацыі, як гэта было ў Маладэчанскім павеце, дзе прыяжджаў пан Інспэктар з войтам і палохалі навет Лукішкамі, напішыце пратакол і зазначце, што ўзялі назад дэклярацыі толькі пад прымусам, а што ад школы сваей не адказваемся і ніколі не адкажамся. Пратакол перашліце ў Галоўную Управу.

Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы.

Трывожная заява Уншліхта.

Выдатны радавы дзеяч Уншліхт заявіў на паседжаньні ў маскоўскім Радыё, што — „міжнародавыя абставіны за апошні час значна пагоршыліся ў сэньсе ваеннай пагрозы“. Дык трэба быць у кожную хвіліну гатовымі да адпору проці нападу на Радавы Саюз. Усё насяленьне Радаў павінна быць „ваенізавана“, інакш Рады не перамогуць капіталістычнага праціўніка пры аружным канфлікце.

СЭРВІТУТЫ.

У сувязі з падпісаньнем Прэзыдэнтам Рэспублікі дэкрэту аб скасаваньні сэрвітутаў— зьмяшчаем тутака стацьцю пасла Сабалеўскага ў справе сэрвітутаў, напісаную яшчэ да акту скасаваньня іх.

Мінула 66 гадоў ад скасаваньня прыгону, але многа памятак па ім захавалася да нашых дзён. Да лічбы гэтых памятак належаць і ведамыя кожнаму селяніну сэрвітуты. Вось, каб выясьніць, скуль і як яны стварыліся, трэба разглядзець існаваўшыя за часоў прыгону зямельныя адносіны наагул.

Абшарнік — валадар жывых людзей — глядзеў на сваіх падданых перадусім, як на рабочую жывёлу, якая аднак-жа, каб працаваць, павінна была быць хоць болей-меней сытая. Дзеля гэтага прыгонны селянін мусіў мець кусок зямлі пад пасеў жыта, пад бульбу ды ярыну, кусок гароду пад буракі, капусту ды пяньку, ды хоць якую кароўку для дзяцей. Абшарнік мусіў гэту зямлю даць, дый таксама і пашай забясьпечыць скаціну. Зямлю даваў ён сваім сялянам, ведама-ж, самую найгоршую і далёкую. Раней існавала сыстэма вольнае распашкі свабоднае зямлі: кожны мог загараць сабе кусок дзікое зямлі, які хацеў. Але пазьней, калі зямлі стала больш скупа, новыя сем'і ўжо не знаходзілі свабоднае зямлі пад распашку,—дык абшарнікі на сваіх зьездах умовіліся ўстанавіць азначаную норму сялянскага валаданьня і, выдзяліўшы з сваіх абшараў адпаведную колькасьць зямлі, пабілі яе — паводле гатунку зямлі—на палеткі і вызначылі для кожнае хаты паласу. Калі-ж гэта дзеля якой-колечы прычыны зрабіць было трудна, дык сялянам пакідалі тое, што яны некалі самі распахалі. У выніку апошняга сялянская зямля аказалася зложанай з параскіданых у розных мясцох маленечкіх кусочкаў; гэтак, у адным месцы нам ведама такая сялянская гаспадарка, якая, маючы 13 дзесяцін, складаецца ажно з 260 кусочкаў, ды кожны кусочак сярэднім лікам мае па 10 заломаў!

Справа пашы выряшалася розна, — ды, ведама, заўсёды так, як было выгадней для абшарніка. Характэрна, што ў вялікіх маёнтках сялянам не выдзялялі асобнага пасьвішча, а вызначалі пад пашу зарасьнякі, лясы, ды іншыя няўжыткі. Угода паміж абшарнікам і сялянамі запісавалася ў кнігі Земскага Суда. Пляная на зямлю ня было, дык запісавалі зямлю па ўрочышчам.

Час ішоў, маёнткі дзяліліся, дзікая зямля загорывалася ўсё больш і больш. На распашках будавалі фальваркі і закладалі самастойныя гаспадаркі. Гэтак часта густа зямля, якой сяляне карысталіся дзеля пасты, аказвалася ў самым цэнтры нававыдзеленага маёнтку. Ня маючы магчымасьці даць сялянам пад пасьвішча зямлю ў другім месцы, абшарнікі вызначалі пад пашу і ворную зямлю, і сенакосы, і гароды. На гэтым груньце ўзьнімаліся спорк і з сялянамі: калі дзе яны могуць пасьвіць сваю жывёлу? Дык быў выданы адумысны закон, які точна ўстанаўляў, што сяляне могуць карыстацца пашай на гэткіх землях толькі пасьля збору ўраджаю, а пакуль яго ня зьнялі, дык пасьвілі на ўсіх вольных землях. Пазьней самі сяляне стараліся замацаваць на паперы свае права пашы на такіх-то і такіх урочышчах. Вось гэтае іх права пасьвіць сялянскую скаціну на панскай зямлі і ёсьць права сялянскага сэрвітуту.

У некаторых мясцовасьцях права сэрвітуту абыймае адно толькі пасту. У другіх, наадварот, існуюць сэрвітуты грыбныя, ягадныя, лыкавыя, дравяныя, тарфовыя і інш.

Зямля пад сэрвітутам зьяўляецца ўласнасьцю абшарніка, і ён мае права рабіць з ёю, што хоча: прадаць, закладаваць, сячы лес і г. д. Калі пры гэтым насека абсеівалася лесам, дык абшарнік даваў сялянам другі палетак. Але рэгістрацыя такіх зьмен не вялася. Сяляне, на падставе гэткае замены, калі лес на старым палетку адрастаў, лічылі, што маюць права пашы і на ім. Узьнімаліся спорк, завастраліся адносіны паміж сялянамі і абшарнікамі. Спорк гэткія ў судох цягнуліся вельмі доўга, вялі іх два тры пакаленьні. Ведамы выпадак, калі спорка аб сэрвітут трывала 75 гадоў і закончылася пры ўнуках тых сялян, якія пачалі спорку. Насталі часы неспакойныя, пачалі гаварыць аб скасаваньні прыгону. Гэта шмат дзе прысьпешыла ліквідацыю спорак. Сяляне згаджаліся дастаць адзін азначаны кусок зямлі замест сэрвітуту — на ўсю вёску, ды гэтак у нас утварылася грамадзкае валаданьне зямлёй—пад пасьвішча, пры сялянскай зямлі. У вялікіх вёсках скаціну пасьвіў стары дазнаны пастух, а яговыя падпаскі — да прыходу галоўнага пастуха—зьбіралі скаціну зараз жа за вёскай: месца, куды зганялі перад пастай скаціну, называлася агульна вясковым выганам.

Часта здаралася, што абшарнік, каб улагодзіць спорку аб пасьвішча, быў прымушаны дазволіць сялянам пасьвіць скаціну тамжа, дзе пасьвіў сваю, — знача, недзе блізка ад свайго двара. У такіх выпадках тварылася супольнае з абшарнікам сялянскае пасьвішча. Гэта бывала пераважна там, дзе вёсачкі былі малыя. Гэткія вёсачкі паўставалі пераважна затым, што абшарнік, каб забясьпечыць свае границы ад ня менш за яго самога ласых на зямлю суседзяў, будаваў на ўзьмежках па некалькі сялянскіх хат, якія і прадстаўлялі нібы жывую агарожу. З гэных хат з ходам часу і вырасталі вёсачкі, якія сьпярша пасьвілі сваю скаціну на ўсім вольным прасторы. Пасьля, калі зямля зьмяняла сваё назначэньне, і пасьвіць на ей было ўжо немагчыма, абшарнік пускаў сялянскую скаціну на свае пасьвішча, калі не пераносіў вёскі ў другое месца.

Урэшце настаў даўно жданы 1861 год. Прыгон быў скасаваны. Паводле закону аб абавязковым звальненьні сялян, за апошнімі было замацавана і іх дасюляшняе валаданьне зямлёй. Адумысныя зямельныя камісіі (так-званыя люстрацыйныя), калі зямельныя адносіны ня былі лішне заблутаны, прыступілі ўраз-жа да замацаваньня зямлі за сялянамі і ўкладаньня пляная. У люстрацыйным акце апісывалі падробна ўсе правы сялян — усяе вёскі агулам і паасобных гаспадароў, там-жа ўпісывалі і парадак сплаты выкупу за зямлю. У асобнай рубрыцы „Примѣчанія“ запісавалі права на сэрвітут, на грамадзкае пасьвішча, на прагон да вадапою і г. д. А калі нечага ня ўпісалі, дык тое для сялян аканчальна прапала, і цяпер даходзіць свайго яны ўжо ня могуць. Калі-ж пры надзяленьні сялян зямлёю пры люстрацыі выяўляліся якія колечы спорк і між сялянамі і абшарнікамі аб зямлю, дык іх аддавалі на разгляд адумысным установам, і тыя выдавалі адпаведныя акты—дадатковыя да люстрацыйных. Такімі дадатковымі актамі зьяўляюцца пастановы і акты Праверачных Камісіяў, уводныя акты міравых пасрэднікаў, рашэньні Губэрскіх да сялянскіх спраў Прысутстваў і прыгаворы судоў. Яны падшываліся да кніг люстрацыйных актаў для кожнае вёскі асобна.

Кнігі люстрацыйных актаў зьяўляюцца галоўнымі дакумантамі, сьцьвярджаючы правы валаданьня сялян. У-ва ўсіх спорках і судох прыгаворы грунтаваліся выключна на зьмесьце люстрацыйных актаў.— Бывалі здарэньні, калі нейкае права сялян ня было ўпісана, — прыкладам, аб вадапою па-за межамі сялянскае зямлі, — а сяляне карысталіся ўсё ж такі гэтым правам, нічога ня плоцячы абшарніку. Вось, тады сяляне, маглі замацаваць за сабой гэтае права толькі на падставе права даўнасьці. Гэтае ж права кажа, калі хто ў працягу 10 гадоў без перарыву валадаў чужой рэчай бяз ніякае платы, ці адбытых, бяз спорак і судоў, — дык у пачатку адзінадцатага году можна судовым парадкам трэбаваць замацаваньня права ўласнасьці на гэтую рэч. Ня можа быць, аднак-жа, права даўнасьці на сэрвітут: можна дабівацца толькі права на супольнае пасьвішча— ці супольна з абшарнікам, ці супольнае для ўсяе вёскі. Але і тут павінна быць абавязкова пастанова суда, якая ўжо ўвайшла ў законную сілу, ды ўводны акт, сьпісаны старшынёй, судовым або станавым приставам земскім начальнікам, міравым пасрэднікам.

Гэтак ува ўсіх выпадках, калі ўзьнімаецца справа аб сэрвітут, ці аб пасьвішча, трэба мець вышэйпаказаныя дакуманты; бяз іх земскія ўстановы адкінуць усе прэтэнзіі, неабаснаваныя дакумантамі. Ведама, цяпер раздабываць іх — вельмі трудна: валасныя архівы ці то пагінулі, ці то вывезены ў Расею суды скасаваны, дакуманты з іх архіваў парасьцяганы. У гэткіх выпадках трэба ў нотарыуса сьпісаць паказаньні асоб, якія ведаюць аб існаваньні гэных дакумантаў і аб іх зьмесьце. Паказаньні будуць важныя, калі гэныя асобы былі на расейскай дзяржаўнай службе і мелі дакуманты ў сваіх руках. Права валаданьня на тую ці іншую рэч можа быць так жа даказана судовым парадкам. Аднак, справы гэткія — такія заблутаныя, што без адваката селяніну з імі справіцца трудна.

Цяпер сяляне павінны пільна сачыць за замацоўваньнем абшарнікамі іх правоў на зямлю ў гіпотэчных пісароў. Робіцца гэта так. Абшарнік згубіў дакуманты. Яму трэба прадаць ці залажыць зямлю. Вось ён робіць плян сваей зямлі (а можа і бяз пляну, толькі падаўшы точнае апісаньне) і падае ў Акружны Суд праз гіпотэчнага пісара заяву аб выдачы яму крэпаснага дакуманту на валаданьне. Ведама, калі ў яго была ці ёсьць спорка з сялянамі, дык аб гэты ён не заяўляе: гэта мусяць зрабіць самі сяляне. Але яны ні аб чым ня ведаюць. Праходзяць 6 месяцаў. Жалабы ад сялян не паступіла. І вось суд выдае абшарніку дакуманты, у якіх няма засьцярогі аб правох сялян. Абшарнік на гэтых дакумантах прадае сваю зямлю,—зьяўляецца новы ўласьнік, які не прызнае сялянскіх правоў, — і вось сялянам прыходзіцца завадзіць з ім судовы працэс — аб няважнасьці купчае крэпасьці. А гэта справа дужа цяжкая!

Вось чаму сяляне мусяць пільна глядзець, каб з імі ня сталася такая рэч. Як толькі даведаюцца аб кроках абшарніка, павінны зараз-жа падаць заяву аб сваіх прэтэнсіях гіпотэчнаму пісару, — і тады, калі абшарнік справы ня ўладзіць, у яговыя дакуманты будзе ўпісана прэтэнсія сялян. І тады, калі абшарнік лічыць гэную прэтэнсію беспадстаўнай, ужо сам ён мусіць гэную беспадстаўнасьць даказаць на судзе.

Юры Сабалеўскі.
пасол Сойму.

кі рэвальвэр, нарыхтаваўся таксама да абароны.

Наступіў рашучы мамэнт: паміж салдатамі і рэвалюцыянэрамі засталося ўжо толькі некалькі крокаў.

— „Назад, подлы найміт!..“ — крыкнуў Ван-Тсун падбягаўшаму ўжо да яго вартаўніку і падняўшы рэвальвэр, выстраліў.

Вартаўнік ступіў яшчэ колькі крокаў уперад, пасьля ўзмахнуў канвульсіўна рукамі і, схапіўшыся за грудзі, грохнуўся аб зямлю.

Гэта паскуткавала на рэшту варты. Ня хочучы рызыкаваць сваімі галовамі, рашылі яны ўзяць Ван Тсуна і храмога асадай, або проста прыстрэліць. Пачалася няроўная барацьба.

— „Здавайся!“—крычалі вартаўнікі.

— „Ніколі!“ — адказаў ім Ван-Тсун, які разам з храмым у часе замяшаньня вартаўнікоў пасьпеў перапаўзьці за вялікі камень.

Вартаўнікі прыцэліліся і выстралілі. Выстралы гулка пракаціліся па вуліцы, але кулі ў Ван-Тсуна не папалі. На выстралы салдат Ван-Тсун і храмы, жалеючы траціць дарма патроны, не адказывалі. Аднак, як толькі салдаты ступілі некалькі крокаў уперад, з-за каменя пачуўся сухі трэск двух рэвальвэраў; салдат, які йшоў наперадзе, крыкнуў і выпусьціў вінтоўку: на рукаве ў яго паказалася чырвоная пляма, і пурпурная кроў тоненькай струйкай пацякла на зямлю.

Перастрэлка разбудзіла спаўшы горад. З усіх дамоў пачалі высоўвацца галовы цікавых.

Дзяржаўшых у горадзе ўладу салдатаў ня любілі за іх патульнасьць да багатых, да англійцаў і французаў, ды за жорсткае абходжаньне з беднымі работнікамі кітайцамі. Неўзабаве азброеныя хто чым папала людзі пачалі выбягаць на вуліцу, каб памагчы Ван-Тсуну і храмому.

Бачучы такі зварот схваткі, салдаты кінуліся ўцякаць

Двух здаровых мужчын надхапілі Ван-Тсуна на рукі.

Аднак, жорсткі лёс і тут ня спрыяў Ван-Тсуну. На выстралы варты ішоў ужо сільны патруль.

— „Стой!... Рукі ўверх!... крыкнуў афіцэр і, бачучы, што работнікі, не зважаючы на яго каманду, кінуліся ўцякаць з якімсьць чалавекам на руках, даў залп.

Глуха пракаціліся выстралы на вуліцы, некалькі чалавек узмахнулі канвульсыўна рукамі і, выпусьціўшы сваю дарагую ношу, асунуліся на зямлю. Праз мамэнт на мейсцы страшнай трагедыі кіпеў ужо запраўдны бой.

— — — — — — — — — — —

Згінуў Ван-Тсун; кроў яго запяклася на вуліцы Вучана, але зерне, кінутае ім у народныя масы расьінуўшыхся па беразе мнагаводнага Янг-Тзэ-Кіянгу трох гарадоў, дарма не прапала.

Пад канец верасьня падышло к Вучану Кантонскае войска і, пасьля кароткай перастрэлкі з ангельскімі наймітамі, пад пераможны сьпеў паўстанцаў заняла скора ўсе тры гарады.

Скора былі ачышчаны і канцэсіі. Усе радасна ўздыхнулі; а народная армія, ўспамінаючы ахвярных байцоў, заплаціўшых жыцьцём сваім за народную справу, скланіла над магілай Тсан-Ван-Тсун свае пабедныя баявыя знамёны.

(Канец).

Майму продку.

Прашлі ўсе дні твае так сьлёзна...
Нядолі глум цябе заеў.
Цярпеў, нат' думаў асьцярожна.
Павысіць голасу ня сьмеў.

* * *

Крывавым потам і мазолем
Другім ты жыцьцё будаваў, —
А ў час аддышкі алкаголем
Свае ты гора заліваў.

* * *

Цябе лічылі за „скаціну“ —
За „хама“, гнойнага жука...
Ня раз, ня раз гаротну сьпіну,
„Часала“ белая рука!

* * *

Ня бачыў шчасьця ты мінуты:
Усё гора, сьлёзы, глум і зьдек...
Ах, сумны, страшны дні пакуты
Твой чалавечы зьелі век!

1/VIII. 1926. С. Галыш.

Усё вышэй, ды вышэй!..

Усё вышэй, ды вышэй — аж да сонца, да зораў,
— Уздымайце свой сьцяг!
Ды наперад нясеце, наперад за горы,
— Ды шукайце свой шлях!
Мі на хвілю прыпынку, бо так можна спазьніцца.
— Дык вышэй і вышэй!
Пакуль бачыце мэты — ня трэ' станавіцца,
— Бо ўвышы — харашэй!
Кіньце звадкі: ня трэ' іх — ужо годзі, даволі!
— Дык уздымайце свой сьцяг!..
Уздымайце да сонца, да зораў, да волі,
— Аж на родны свой шлях!
Мі на хвілю спачынку, бо гэта нашкодзіць.
— Падганяй рух жывей!
Глянь, бліжэюць усьцяж мэты—мамэнт ясны надходзіць
— Дый што раз — весялей!

Тамаш Воля.

ХРОНІКА.

Прысуд рэдактару Макуліку. У панядзелак, 21 лютага, віленскі акружны суд разглядаў справу б. рэдактара „Беларускае Справы“ Сымона Макуліка. Судзілі яго за надрукаваньне стацьцей: „13.000 польскіх асаднікаў на Усходзе“, „8 зьезд парабкоў“, „Амністыя“ і „Палітычныя вязьні Горнага Сьлёнску да ўсіх работнікаў. Першая з гэтых стацьцей—перадрук з „Dzien. Wil.“, адозва горна сьлёнскіх вязьняў—з газэты „Sprawiedliwość“. За ст. „Амністыя“ суд засудзіў рэд. Макуліка на 1 год вастрогу, за адозву вязьняў — на 2½ году крэпасьці. У справе ст. „13.000 асаднікаў“ суд адкінуў вяправільна тасаваную ст. 129 К. К. і загадаў дасьледаваць справу нанова.

„Kur. Wil.“ адзначае, што гэта—„найцяжэйшы прыгавор у прэсавай справе на ўсю Польшчу“!

Беларускія паслы ў Вронках. „Роботнік“ піша:—„Некалькі дзён таму арыштаваныя беларускія паслы перавезены ў карны вастрог ў Вронках, у Пазнані. Вронкі—карная турма, а беларускія паслы знаходзяцца толькі пад сьледчым арыштам“. Дык — чым запраўды вытлумачыць новае нарушэньне закону ў адносінах да прадстаўнікоў беларускага народу?—„У Вронках, як у мяйсцовасьці былага прускага забору, ня маюць сілы правілы аб інакшым адношаньні да палітычных вязьняў, чым да звычайных угалоўных арыштантаў“... Далей „Роботнік“ кажа, што „перавоз да Вронкаў беларускіх паслоў ня можна зразумець ні з якога пункту гледжаньня“ (дадамо: праўнага) „Выглядае так, што камусьці залежыць на тым, каб карміць усё новымі фактамі крыніцы антыпольскай кампаніі заграніцай“..

Каму на чым, але паном пэпэсам залежыць, здаецца, толькі — на „добрай апініі аб Польшчы заграніцай“...—Аб гэтым толькі яны, як ведама, стараліся і на апошнім кангрэсе II Інтэрнацыяналу. Ці ня з гэтай пераважна крыніцы плыве „публічны пратэст“ пэпэсаў проці новага „акту справядлівасьці“ з боку п. міністра справядлівасьці?!.

Водгукі арышту паслоў. „Жэчпосполіта“ ў нядзельным нумары паведамляе, што ў Слоніме ў часе торгу адбылася дэманстрацыя і гаварыліся проціўрадавыя прамовы. Утварыўся паход з транспарантамі, на якіх былі надпісы: „Аддайце нам нашых паслоў“! ды іншыя—на чэсьць Радавае Беларусі і проці „фашыстаўскага ўраду“. Паліцыя разганяла натоўп. Заарыштаваны некалькі асоб.

Водгукі крывавае расправы ў Косаве. „Słowo“ паведамляе аб новай дэманстрацыі Бел. Сял-Раб. Грамады ў в. в. Малыц і Вялікія Галікі, Косаўскага пав. Вялізарная грамада сялян з гэтых вёсак прынялі ўчасьце ў пахароннай працэсіі ў часе хаваньня забітых у Косаве. Спасярод учасьнікаў паходу быццам пачуліся проціўрадавыя выкрыкі. Паліцыя, паклікаўшы дапамогу з Дзявяткавіч, разагнала народ. Арыштаваны Ціхан і Рыгор Петрашкевічы—абодва грамадзісты.

Грамадзістаў звальняюць, але толькі... ад службы. 12 II у матарыяльным складзе ст. Вільня звальнілі ад служаы грамадзістаў: Браніслава Пяхоцкага, Казюка Мецанца, Уладзіміра Аўсейку, Арцёма Пекача, Янку Бэрэнта і Тодара Рамановіча, бо пан Зволяновскі баяўся, каб і ён ня быў звольнены за тое, што трымае на складзе грамадзістаў..

Чарговая лекцыя. Чарговую суботнюю лекцыю ў Цэнтральным Гуртку Т-ва Бел. Школы (вул. сьв. Анны 2) прачытае 26 лютага ў 7 гадз. увечары грам. А. Зянюк. Тэма—**Зямельнае пытаньне**.

Як бачым, лекцыі ў Гуртку па свайму зьместу зьяўляюцца дужа рознароднымі і абыймаюць усе галіны нашага жыцьця.

Барацьба з культурнай працай. Дачэсны кіраўнік гуртка Т-ва Беларускае Школы ў в. Малыя Галікі, Дзевяткаўскае гміны, Слонімскага пав., Ал. Лашко, прыслаў у Галоўную Управу Т-ва Беларускае Школы ў Вільні гэткае паведамленьне:

„Гэтым паведамляю, што на паданае мною паведамленьне да слонімскага старасты на сход, каторы меўся адбыцца 19. I. г. г. — ня прыняў да ведама. Забарону ўспамянутую пры гэтым далучаю.

„Адначасна паведамляю, што ў дню 5 га лютага г. г. паліцыя рабіла ў мяне рэвізыю, пры каторай, знайшоўшы Вамі прысланую мне дадатковую інструкцыю, як тварыць бібліатэкі чытальні, забрала і 2 адозвы Грамады. Рэвізія нібы роблена з прычыны крывавых падзеяў у Косаве-Палескім і шукалі „пшэцівпаньствовэго матэр'ялу, ня гледзячы на тое, што я ляжу ад 24. I. 27 г. цяжка хворы на запаленьне лёгкіх і сёньня яшчэ з ложка ня злажу; адвак шукаюць, каб прычапіцца. Мой адказ: „я беларус — і нічога не баюся“.

Так выглядае ўрадавая барацьба з... „камунізмам“!..

Курсы для вучыцялёў. Польскія газэты публікуюць вестку, што школьныя ўлады арганізуюць дапаўняючыя курсы для былых расейскіх народных вучыцялёў. Курсы маюць трываць год і пачнуцца з восені. Прынімаць на курсы будуць толькі мужчын, быўшых ужо вучыцялямі і знаёмых з беларускай мовай.

Кандыдаты павіны падаць школьнаму інспэктару свайго павету просьбу, напісаную ўласнаручна, — кожын ад сябе. Трэба падаць пры гэтым дакуманты: 1) мэтрыку, 2) пасьведчаньне тожсамасьці асобы з фатаграфіяй, 3) доказ польскага абыватэльства, калі гэта не адзначана ў пасьведчаньні асобы. 4) пасьведчаньне павятовага доктара аб здатнасьці да вучыцельскае прафэсіі, напісанае паводле ўрадавых узораў, 5) вучыцельскія дакуманты, якія сцьвярджаюць, што кандыдат здаў экзамены на народнага вучыцеля (ці на дамовага), або скончыў вучыцельскую сэмінарыю ці ўрадавую (або з урадавымі правамі) гімназію ды мае прынамся двухгадовую вучыцельскую практыку ў дзяржаўнай школе, 6) дэклярацыю, якую дастане ў інспэктарацэ. Калі чаго-небудзь з гэтых дакумантаў ня хопіць, дык просьба разглядацца ня будзе.

Прынятыя на курсы кандыдаты будуць узяты да працы, як практыканты, ад 1 красавіка 1927 г. — на варунках кантрактовых вучыцялёў.

Тэрмін пачатку навукі на курсах будзе абвешчаны міністэрствам асьветы.

Пахароны д-ра Бассановіча. 21 лютага адбыліся ўрачыстыя пахароны найстарэйшага з пачынальнікаў літоўскага адраджэньня, д-ра Яна Бассановіча. У працэсіі бралі ўчасьце масы народу ўсіх нацыянальнасьцяў. Зложана шмат вянкоў — у тым ліку ад Беларускага Навуковага Т-ва, Т-ва Беларускае Школы і інш. Рад прамоўцаў разьвітваўся з нябожчыкам у ва ўсіх краёвых мовах.

На пахароны прыехалі з Коўны прадстаўнікі тамтэйшага літоўскага грамадзянства: прэзыдэнт м. Коўны Іонас Вілэйшыс, рэктар ун-ту М. Біржышка, інж. Кайрыс, праф. Янулайтіс, кс. Тумас і інш.

Забастовачны рух у Вільні. Паводле польскіх газэт, у Вільні распачынаецца цэлы рад работніцкіх забастовак. Ад панядзелку мелі забаставаць шавецкія работнікі, якія, ня маючы магчымасьці пракарміцца з сваіх жабрацкіх заробкаў, дамагаюцца павялічэньня платы.—Апрача таго рыхтуюцца да забастоўкі работнікі шкляных гутаў, якія трэбуюць прыбаўкі платы на 30 прац.

Выкручваюцца! Хадэцка сельсаюзьніцкая прэса зрабіла закід рэдакцыі „Народнага Звону“, быццам у яе складзе ёсьць... былы паліцэйскі камэндант! Рэдакцыя „Звона“ патрэбавала апублікаваньня прозьвішча гэнага „камэнданта“. Але-ж „Сял. Ніва“ цяпер выкручваецца: публікаваць адмаўляецца, ды абяцуе... сказаць Рэдакцыі „Звона“.

На што-ж гэткая „далікатнасьць“ і як тут можа быць сакрэт?

„Урадавая“ мова ў Рэдакцыі „Сял. Ніва“? Надовячы ў Рэдакцыю нашае газэты былі прысланы тры нумары „Сялянскае Нівы“, і на адным з іх мы прачыталі надпіс у расейскай мове:

„Наш Голос. Посылайте газеты по адресу Завальная № 6 кв. 5“.

Ці надпіс гэты паказуе на ўзмацаваньне ўплываў пана Рагулі, які ў 1917 годзе на вучыцельскім зьезьдзе ў Менску пратэставаў проці ўжываньня прамоўцамі беларускае мовы і трэбаваў, каб гаварылі „на родном русском языке“?!

Афіцыяльны курс грошы на 22 лютага. Даляр — 8 зл 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 58 гр.

22./II. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70 Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Грамадзкая ахвярнасьць.

× Варанілаўскі Гурток Т-ва Беларускае Школы выносіць вялікую падзяку Клепачоўскаму Гуртку Бел. Сял.-Раб. Грамады, які ахвяраваў на арганізацыю ў нас бібліатэкі-чытальні 8 зл., а таксама і грам. Ласасінскаму, які ахвяраваў 10 зл.

× Варанілаускі Гурток Т-ва Беларускае Школы шчыра дзякуе ніжэйпаданым грамадзянам нашай вёскі Варанілаўцаў злажыўшым ахвяры на арганізацыю бібліатэкі-чытальні ў сваей вёсцы Варанілаўцах: Новік Мікалай—1 зл. 50 гр., Новік Язэп—1 зл. 50 гр., Новік Аляксей—1 зл., Макарэвіч Антон—1 зл. 50 гр., Сёмка Паўлюк—1 зл. 50 гр., Макарэвіч Аўгеві—1 зл. 50 гр., Макарэвіч Язэп—1 зл. 50 гр., Сухадольскі Мікалай—1 зл. 50 гр., Сухадольскі Серафім—1 зл. 50 гр., Ёрш Аляксандар—1 зл. 50 гр., Пракапеня Мікалай—1 зл. 50 гр., Тур Андрэй—1 зл. 50 гр., Руды Міхась—1 зл. 50 гр., Тур Міхась—1 зл. 50 гр., Тур Сьцяпан—1 зл. 50 гр., Ерш Якуб 1 зл., Ерш Міхась—1 зл., Руды Васіль—1 зл. 50 гр., Руды Антон—1 зл. 50 гр., Дрозд Андрэй—1 зл. 50 гр., Казлоўскі Ігнат—1 зл. 50 гр., Казлоўскі Язэп—1 зл. 50 гр., Сухадольскі Тамаш—1 зл. 50 гр., Тур Васіль—1 зл. 50 гр., Тур Пётр—1 зл. 50 гр., Тур Аляксандар—1 зл. 50 гр., Руды Паўлюк—1 зл. 50 гр., Ерш Аляксандар Максімаў—1 зл. 50 гр., Ахраменя Максім—1 зл. 50 гр., Сухадольскі Зьмітрук—2 зл., Сухадольскі Сымон 1 зл. 50 гр., Новік Ільяш—1 зл., 50 гр., Сухадольскі Павал—1 зл. 50 гр., Хадыка Аляксандар—1 зл. 50 гр., Тур Павал—1 зл. 50 гр., Тур Аляксей—1 зл. 50 гр., Ахраменя Мікалай—1 зл., Ахраменя Васіль—1 зл., Казёл Аляксандар—1 зл., Ахраменя Антон—1 зл. 50 гр., Сухадольскі Зьмітрук Алякс.—1 зл. 50 гр., з вёскі Берэзьніца—Пракапеня Васіль 1 зл. 50 гр., Пракапеня Аляксандар—1 зл. 50 гр. Агулам—62 злотых.

Управа Гуртка
ў в. Варанілаўцах.

× Слонімскі Павятовы Камітэт Белар. Сялян.-Работ. Грамады складае шчырую падзяку грамадзянам з ніжэйпамянёных вёсак, якія злажылі ахвяры грашыма і натураю на дапамогу палітычным вязьням знаходзячымся ў Слонімскім вастрозе: вёска Парэчча, Кастравіцкае гм., 30 зл., в. Варонічы, Міжавіцкае гм., 24 зл., в. Сенькаўшчына, Кастравіцкае гм., 39 зл. 70 гр., в. Сакалова, Чамерскае гм., 34 зл., і в. Хамічы, Казлавецк. гм., 3 зл. Разам—130 зл. 70 гр.

× Касьцянеўскі Гурток Белар. Сял.-Раб. Грамады, выносіць шчырую падзяку тым грамадзянам з в. Грынкі, якія злажылі ахвяры палітычным вязьням у суме 11 зл. 70 гр.

Камітэт Гуртка.

× Управа Кудзевіцкага Гуртка Т-ва Белар. Школы ў в. Кудзевічах, Маўчадзкае гм., шчыра дзякуе за зложаныя ахвяры на карысьць бібліатэкі-чытальні наступнымі грамадзянамі: Аляксандра Крэнь—4 зл., Сьцяпан Шэйна—20 гр., Мікалай Журка—10 гр., Хрысьціна Журка—10 гр., Павал Саўчук—10 гр., Анатолі Саўчук—10 гр., Адам Камар—50 гр., Тодар Віннічак—50 гр., Ф. Доўнар—40 гр., Ф. Бакач—30 гр., Максім Бакач—50 гр., Ігнась Бакач—50 гр., Іван Бакач—50 гр., Кацярына Бакач—30 гр., Аўгеньня Бакач—30 гр., Зіна Бакач—30 гр., Ярашоўскі Гурток Бел. Сял.-Раб. Грамады—5 зл.; грамадз. Сьцяпану Шэйне і Рыгору Камару з в. Ярашова, Маўчадзкае гм., за ахвяраваньне для бібліатэкі-чытальні па 20 кніжак.

Управа Гуртка просіць усіх грамадзян, спачуваючых развіцьцю беларускае культуры, прысылаць свае хаця-бы самыя маленькія ахвяры, для бібліатэкі-чытальні па адрасу: Пошта Моўчадзь (Mołczadź), в. Кудзевічы, Баранавіцкага павету. Скарбнік Гуртка Аляксандар Бакач. (Poczta Mołczadź, wieś Kudziewicze, pow. Baranowickiego. Skarbnik Hurtka T-wa Białoruskiej Szkoły—Aleksander Bokacz).

Управа Кудзевіцкага Гуртка
Т-ва Белар. Школы.

З Радавае Беларусі.

Водгукі арыштаў беларускіх паслоў.

„Słowo“ пераказуе вестку ковенскага ўрадавага агенцтва, што па ўсіх местах і мястэчках Радавае Беларусі адбыліся вечы і дэманстрацыі пратэсту проці арыштаў беларускіх паслоў і дзеячоў у Зах. Беларусі, а такжа проці вывазу іх з Вільні ў вастрог у Вронках, каля Пазнані. На вечах прыняты варожыя да Польшчы рэзалюцыі. „Słowo“ лічыць асабліва характэрным, што падобныя вечы адбываліся ў-ва ўсіх вайсковых часьцінах. Рэзалюцыі апошніх дамагаюцца абвяшчэньня вайны Польшчы і далучэньня аружнай сілай Заходняе Беларусі да Радавае.

Паштовая скрынка.

Віктару Цямошыку. Вашай карэспандэнцыі не зьмяшчаем, бо нічога ў ей цікавага няма. — **Міхасю Волату.** Вершаў Вашых ня друкуем, бо надта вострыя яны.—**Дзеду Ігнату і ўнуку Барысу.** Зьмясьціць ня можам, занадта востра. Пішыце лепш прозай.— **Р. Зенкевічу.** Пішыце ясьней і разборчывей. — **Сярмяжніку.** З прысланага выкарыстоўваем толькі частку, з астальным пачакайце. — **Самойліку.** Верша не зьмяшчаем, бо няма ў ім складу. З карэспандэнцыі выкарыстоўваем толькі частку. — **Юльяну Яроцкаму.** Вашы прызнаньні ў віне крыху запазьніліся, таму ня друкуем. — **Скрыцу.** Такога вершу ніколі зьмясьціць ня можам. Пішыце лепш аб усім што ў Вас робіцца і прозай, а ня вершам. — **Антону Гардзею.** Ой гэтыя вершы! закідаюць нас імі, а зьмяшчаць ня можам! То вострыя надта, то ня маюць складу. Пішыце лепш прозай.

Усячына.

Сколькі каштуець утрыманьне дзяржавы.

„Tygodnik Handlowy“ аблічаець вартасьць прадукцыі за год у Польшы на 9.500.000.000 зл. з гэтага:

прадукцыя „rolna“ — — —	6.500.000.000
дабыча вугальля і мэталяў —	1.500.000.000
прадукцыя прамысловая— —	1.500.000.000
Разам —	9.500.000.000

Выдаткі дзяржаўныя маюць вынасіць на гэты год каля 2.000.000.000 зл., а самаўрадовыя 800.000.000 зл., гэта значыць — каля 30 проц. усей прадукцыі. Утрымоўваць гэтакага дарагога даглядчыка гаспадаркі і „парадкаў“ грамадзкага жыцьця, навет калі-б надатковыя цяжары былі справядліва разложаны на насяленьне, — запраўды-ж не пад сілу народу!

Паважаных падпішчыкаў, якія яшчэ не ўнармавалі падпісной платы, просіма безадкладна выслаць належныя з іх грошы за час да 31.XII 1926 году.

Адміністрацыя.

ГРАМАДЗЯНЕ! Хто яшчэ хоча набыць

Беларускі Адрыўны Календар

обо

КАЛЕНДАР-КНІЖКУ на 1927 год

Беларускага Выдавецкага Т-ва, то гэта яшчэ можна зрабіць, бо Т-ва, выпускаючы календар другім выданьнем, разьлічвала на здаваленьне як найбольшага ліку беларускага насяленьня, уважаючы, што зьмест календароў высьвятляе ўсе балячкі нашага жыцьця і дае найлепшыя парады для палепшаньня нашага стану.

Разам з тым Выдавецкае Т-ва паведамляе тых грамадзян, якія прыслалі грошы на календары раней, што задзержка ў высылцы абодвух календароў была зьвязана з перавыданьнем адрыўнога і цяпер календары высылаюцца.

ВЯЛІКІ БЕЛАРУСКІ ХОР

пад кіраўніцтвам грам. **Р. ШЫРМЫ**

арганізуе Віленскі Цэнтральны Гурток Т-ва Беларускай Школы. Абавязак усіх сяброў Т-ва Белар. Шк.—і жанчын і мужчын — прыняць жывы ўдзел у гэтай справе і зьявіцца на сьпеўкі, якія адбываюцца штосераду і штопятніцу ад 6 гадз. в. у памешканьні Цэнтральнага Гуртка Т-ва Б. Ш. (**вул. Сьв. Ганны 2**).

У хор могуць уступіць і асобы, што не зьяўляюцца сябрамі Т-ва Б. Ш.

Рэдактар Выдавец: **Альбэрт Эйсак.** Друкарня Я. Левіна. Вільня, Нямецкая 22.

Bibl. ... Wilno ... im. Wróblewskich